# Заява Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі

Аўтар: Каталіцкія Біскупы Беларусі
21.02.2016 01:00



Канферэнцыя Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі на 61-ым пленарным пасяджэнні 4 лютага 2016 г. абмеркавала пытанне, звязанае з нядаўнім выказваннем Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей Леаніда Гулякі, якое датычыла дзейнасці каталіцкага Касцёла ў нашай краіне. **Канферэнцыя Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі лічыць неабходным звярнуць увагу на наступнае:**

**1.** Справа падрыхтоўкі святароў з'яўляецца выключна ўнутранай справай Касцёла, які клапоціцца пра сваю будучыню (дарэчы, у гэтым годзе 19 чалавек распачалі навучанне ў семінарыях Беларусі і ў манаскіх семінарыях за мяжой), і абвінавачваць яго ў незацікаўленасці і недастатковай "працы з кадрамі" беспадстаўна.

**2.** Каталіцкая тэалагічная акадэмія імя святога Яна Паўла II зарэгіставана. Цяперашні этап – атрыманне зямельнага надзелу, далей – узвядзенне будынка, і толькі пасля гэтага акадэмія распачне сваю дзейнасць, што таксама з'яўляецца выключна ўнутранай справай Касцёла.

**3.** Іншыя ўзнятыя спадаром Леанідам Гулякам тэмы могуць быць абмеркаваны пры асабістай сустрэчы Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі з Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцей. †

**Ад рэдакцыі:**

У аўторак, 2 лютага, Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей Беларусі Леанід Гул

*"Рымска-каталіцкі Касцёл у Беларусі, як і раней, недастаткова актыўна пра*

Аўтар: Каталіцкія Біскупы Беларусі
21.02.2016 01:00